ISSN 2524-2369 (Print)
ISSN 2524-2377 (Online)
УДК [930:329](476)«19» Паступіў у рэдакцыю 23.10.2019
https://doi.org/10.29235/2524-2369-2020-65-2-172-180 Received 23.10.2019

**П. А. Трубчык**

*Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка, Мінск, Беларусь*

# ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ВЫВУЧЭННЯ ЛІБЕРАЛЬНЫХ ПАРТЫЙ І ІХ АДГАЛІНАВАННЯЎ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў ПАЧАТКУ XX ст.

**Аннотация.** Проведен объективный и всесторонний анализ хода, итогов, значения и перспектив исследования истории либеральных партий и их отделов на территории Беларуси в начале XX в. При определении периодов в развитии историографии изучения политических партий выделена дореволюционная, советская и современная (или новейшая) историография.

Сделаны выводы о том, что российская и отечественная историография основательно, с разных концептуальных и методологических позиций, изучила либеральное движение начала XX в., отметив практически все возможные точки зрения на его роль и место в общественно-политической жизни страны. Дальнейшие перспективы научного поиска по данной проблематике лежат в разных плоскостях: выявление и изучение тех факторов общественно-политического развития Беларуси, которые обусловили невозможность исторического компромисса между властью и либералами; более детальное изучение политических биографий и систем взглядов представителей либерального движения, причем не только лидеров, что отчасти уже сделано, но и «простых» участников, а также факторов, которые влияли на их мировоззрение; детальное изучение социокультурной среды на белорусских землях, в которой формировались либеральные ценности. Требует обновления методологический аппарат исторических исследований: использование макро- и микроподходов новой социальной истории, психоистории, семиотики; решать исследовательские проблемы необходимо средствами, заимствованными из разных сфер знаний.

**Ключевые слова:** историография, либеральные партии, общественно-политическая жизнь, Первая российская революция, политическая история

**Для цитирования:** Трубчык, П. А. Гістарыяграфія вывучэння ліберальных партый і іх адгалінаванняў на тэрыторыі Беларусі ў пачатку XX ст. / П. А. Трубчык // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2020. – Т. 65, № 2. – С. 172–180. https://doi.org/10.29235/2524-2369-2020-65-2-172-180

**Pavel A. Trubchyk**

*Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank, Minsk, Belarus*

## HISTORIOGRAPHY OF STUDYING THE LIBERAL PARTIES AND THEIR DEPARTMENTS ON THE TERRITORY OF BELARUS AT THE BEGINNING OF THE XX CENTURY

**Abstract**. An objective and comprehensive analysis of the course, results, significance and prospects of studying the history of liberal parties and their departments in Belarus at the beginning of the 20th century was carried out. When determining periods in the development of historiography of the study of political parties, pre-revolutionary, Soviet, and modern (or newest) historiography is distinguished.

It is concluded that Russian and Belarusian historiography thoroughly, from different conceptual and methodological positions, studied the liberal movement of the early 20th century, noting almost all possible points of view on its role and place in the country's social and political life. Further prospects for a scientific search on this issue lie on different planes: the identification and study of those factors of the socio-political development of Belarus that made impossible a historical compromise between the authorities and liberals; a more detailed study of political biographies and belief systems of representatives of the liberal movement, not only leaders, which has already been partially done, but also "simple" participants, as well as factors that influenced their worldview; a detailed study of the sociocultural environment in Belarus, in which liberal values were formed. The methodological apparatus of historical research requires updating: the use of macro- and micro-approaches of the new social history, psychohistory, semiotics; research problems must be solved by means borrowed from different fields of knowledge.

**Keywords**: historiography, liberal parties, social and political life, First Russian revolution, political history

**For citation:** Trubchyk P. A. Historiography of studying the liberal parties and their departments on the territory of Belarus at the beginning of the XX century. *Vestsi Natsyyanal'nai akademii navuk Belarusi. Seryia humanitarnykh navuk = Proceedings of the National Academy of Sciences of Belarus. Humanitarian Series*, 2020, vol. 65, no. 2, pp. 172–180 (in Belarusian). https://doi.org/10.29235/2524-2369-2020-65-2-172-180

© Трубчык П. А., 2020

**Уводзіны.** Вывучэнне гісторыі лібералізму пачатку XX ст. уяўляе сабой актуальную навуковую і палітычную задачу. У глабальнай трансфармацыі ўсіх бакоў грамадскага і дзяржаўнага жыцця, якую перажываюць з канца мінулага стагоддзя беларускія землі, ліберальная ідэалогія і палітычная практыка адыгрываюць адну з вядучых роляў. Практычна немагчыма ўявіць сучасную палітычную сістэму дэмакратычнай дзяржавы без партый і рухаў ліберальнага кірунку. Гісторыя XX ст. паказала, што ліберальныя каштоўнасці, нягледзячы на ўсе выпрабаванні, застаюцца прыцягальнымі для значнай колькасці людзей. У сувязі з гэтым актуалізуецца даследаванне гісторыі ліберальных партый пачатку XX ст., у якіх пачаўся якасна новы перыяд развіцця. Падчас Першай расійскай рэвалюцыі аформіліся ліберальныя партыі (Канстытуцыйна-дэмакратычная партыя (КДП), «Саюз 17 кастрычніка»), якія актыўна дзейнічалі на палітычнай арэне да ўсталявання савецкай улады ў краіне. За гэты час яны распрацавалі мадэль перабудовы Расійскай імперыі, куды ўваходзілі і беларускія землі, заснаваную на прынцыпах грамадзянскай супольнасці і прававой дзяржавы. Нягледзячы на тое, што ліберальныя каштоўнасці не былі ўспрыняты большай часткай грамадства, дзейнасць палітычных партый ліберальнага кірунку таго часу дае павучальныя ўрокі для сучаснасці, іх ідэі выкарыстоўваюцца ў палітычнай практыцы ў нашы дні.

Гэтым абумоўлена навуковая задача – аб’ектыўна і ўсебакова прааналізаваць працэс, вынікі, значэнне і перспектывы даследавання гісторыі ліберальных партый і іх адгалінаванняў на тэрыторыі Беларусі ў пачатку XX ст. Такая праца дазволіць зрабіць больш поўнымі і аб’ектыўнымі навуковыя ўяўленні аб палітычнай гісторыі нашай краіны ў XX ст., развіцці айчыннай гістарыяграфіі на працягу стогадовага перыяду, выявіць праблемы і вызначыць задачы далейшага развіцця гістарычнай думкі.

Розныя аспекты гісторыі палітычных партый пачатку XX ст. распрацоўваліся многімі даследчыкамі. Пры вызначэнні перыядаў у развіцці гістарыяграфіі вывучэння палітычных партый найбольш часта ўжываецца агульная перыядызацыя гісторыі гістарычнай навукі, цесна звязаная з асноўнымі этапамі айчыннай гісторыі. У сувязі з гэтым вылучаецца дарэвалюцыйная, савецкая і сучасная (ці найноўшая) гістарыяграфія.

**Асноўная частка.** Асновы вывучэння палітычных партый закладваліся ў дарэвалюцыйны перыяд. Першыя спробы асвятлення гісторыі лібералізму пачатку XX ст. былі зроблены гісторыкамі, палітыкамі, грамадскімі дзеячамі ва ўмовах вострай ідэйна-палітычнай барацьбы 1905–1917 гг. Большасць аўтараў пры гэтым былі непасрэднымі ўдзельнікамі апісваемых падзей (М. М. Вінавер, М. А. Грэдэскул, П. М. Мілюкоў, П. Б. Струвэ і інш.) [1–4]. Іх працы з’яўляюцца адначасова і гістарыяграфічным фактам, і крыніцай. З аднаго боку, яны неслі значную фактала-гічную інфармацыю, але ў той жа час змяшчалі ацэнкі і характарыстыкі, якія выходзілі на ўзровень канцэптуальных абагульненняў.

Асноўныя канцэптуальныя падыходы да гісторыі лібералізму вынікалі з палітычных поглядаў аўтараў і адпавядалі тром асноўным напрамкам грамадскай думкі: ліберальнаму, кансерватыўнаму, сацыялістычнаму.

Першы зыходзіць з таго, што галоўная мэта лібералаў – мірнае эвалюцыйнае рэфармаванне краіны на прынцыпах грамадзянскай супольнасці і прававой дзяржавы на аснове разумнага кампрамісу з уладай. Адсюль вынікае прызнанне тактыкі заканадаўчай парламенцкай работы як адзіна магчымай ва ўмовах, якія складваліся на пачатку XX ст. (з 1906 г.). Пры гэтым асноўная віна за рэвалюцыйныя ўзрушэнні ўскладвалася, з аднаго боку, на ўладу, якая не здолела знайсці паразумення з грамадствам і ліберальнай апазіцыяй, з другога – на левыя партыі, якія займалі дэструктыўныя пазіцыі, а ў Дзяржаўнай думе займаліся рэвалюцыйнай прапагандай замест парламенцкай работы.

У аснове кансерватыўнага погляду на лібералізм знаходзілася сістэмаўтваральная ідэя аб тым, што лібералізм як з’ява заходняй цывілізацыі не адпавядала гістарычным рэаліям Расійскай імперыі. Пры такім падыходзе лібералы з’яўляліся ледзь не галоўнымі вінаватымі ў сацыяльна-эканамічным і палітычным крызісе ў пачатку XX ст. Дадзеныя тэарэтычныя ўстаноўкі вызначылі як “абвінаваўчую” накіраванасць, так і тэматыку работ пра лібералаў. Аўтары кансерватыўнага напрамку, правыя лібералы не лічылі патрэбным сур’ёзна аналізаваць сістэму поглядаў

і каштоўнасцей расійскіх лібералаў, ідэалогію іх палітычных партый, якія дзейнічалі ў тым ліку і на беларускіх землях.

Крытычныя характарыстыкі дзейнасці ліберальных партый былі ўласцівы работам аўтараў, якія прытрымліваліся сацыял-дэмакратычнай ідэалогіі (меншавікоў і бальшавікоў), хаця ўзровень крытыкі, якая змяшчаецца ў меншавіцкай і бальшавіцкай літаратуры, быў розным.

У 1909–1914 гг. пад рэдакцыяй сацыял-дэмакратаў Ю. В. Мартава, С. М. Маслава і А. М. Патрэсава выйшаў пяцітомнік «Общественное движение в России в начале XX века» [5]. Зборнік з'яўляўся спробай асэнсавання перадумоў, ходу і вынікаў Першай расійскай рэвалюцыі. У ім змяшчаецца аналіз гісторыі ўсіх галоўных палітычных партый Расіі, у тым ліку прыводзяцца некаторыя звесткі аб колькасці і тактыцы кадэтаў і акцябрыстаў на тэрыторыі Паўночна-Заходняга краю. Аўтары сцвярджалі, што ліберальная буржуазія з'яўлялася актыўнай апазіцыйнай сілай у барацьбе з самадзяржаўем. Больш таго, партыю кадэтаў аўтары-меншавікі адназначна лічылі дэмакратычнай.

Іншыя ацэнкі лібералаў змяшчаліся ў працах бальшавіцкіх аўтараў, дзе даказваліся буржуазная класавая накіраванасць ліберальных партый і контррэвалюцыйны характар іх дзейнасці. Гэта даследаванні В. В. Вараўскага, А. В. Луначарскага, а таксама іншых аўтараў і, галоўным чынам, У. І. Леніна, які адыграў галоўную ролю ў фарміраванні гістарыяграфічнай традыцыі, што стане адзінай у СССР [6; 7, с. 410]. У такіх працах дэкларавалася, што галоўная мэта лібералаў – усталяваць у краіне буржуазны лад, ліквідаваўшы перажыткі феадалізму. Але на рашучыя метады барацьбы лібералы былі няздольны з-за баязлівасці і слабасці буржуазіі, цесна звязанай з самадзяржаўем, а таксама з-за асцярогі выклікаць у краіне народную рэвалюцыю. Адсюль вынікаюць умеранасць тактыкі лібералаў і іх імкненне дамовіцца з імператарскай уладай. У цэлым жа, на думку сацыялістаў, парламенцкая тактыка ліберальнай апазіцыі не магла прынесці поспеху з-за слабасці лібералаў і вастрыні перажывемага краінай крызісу, пераадолець які можна было толькі рэвалюцыйным шляхам.

Асаблівае месца ў дарэвалюцыйнай гістарыяграфіі займае выдадзены ў 1910 г. пад рэдакцыяй А. І. Кастэлянскага зборнік "Формы национального движения в современных государствах", які быў напісаны калектывам даследчыкаў на матэрыялах трох імперый – Аўстра-Венгерскай, Расійскай і Германскай [8]. На прыкладзе нацыянальных рэгіёнаў Расійскай імперыі аўтары характарызавалі пашырэнне ліберальнай ідэалогіі, у тым ліку і на беларускіх землях. У раздзеле "Недержавные национальности и первые этапы национального строительства" былі змешчаны публікацыі М. Грушэўскага – аб украінцах, Р. Петэрсана – аб латышах, С. Дубнова – аб яўрэях, Л. Кржывіцкага і М. Ромера – аб паляках Польшчы і Паўночна-Заходняга краю, З. Авалава – аб грузінах, С. Ціграняна – аб армянах. У гэты ж раздзел увайшоў артыкул А. Навіны (А. Луцкевіча) "Белорусы", дзе аўтар аналізуе прычыны і перадумовы зараджэння беларускага нацыянальнага руху [9, с. 32–33].

Такім чынам, у дакастрычніцкі перыяд пачалі фарміравацца некалькі гістарыяграфічных традыцый асвятлення праблемы. Гэта разнастайнасць, як правіла, была звязана з адрозненнем ідэалагічных пазіцый, светапоглядным плюралізмам аўтараў, якія належалі да тых ці іншых палітычных (партыйных) груповак і падзялялі іх погляды і праграмы. Аднак у Расіі пасля кастрычніцкіх (1917 г.) падзей атрымала развіццё толькі бальшавіцкая канцэпцыя. Астатнія былі выцеснены разам з іх носьбітамі за межы дзяржавы і рэалізоўваліся ў працах эмігрантаў, а з цягам часу – у працах заходніх навукоўцаў.

Савецкі перыяд гістарыяграфіі праблемы звязаны з афармленнем і функцыянаваннем аднапартыйнай палітычнай сістэмы. Ён характарызуецца наяўнасцю адной метадалагічнай парадыгмы (марксісцка-ленінскай). Многія пытанні, звязаныя з гісторыяй "непралетарскіх" партый, знаходзіліся пад ідэалагічнай забаронай. Гэтым тлумачыцца малая колькасць даследаванняў, прысвечаных арганізацыям ліберальнага кірунку.

Пачатак вывучэнню арганізацыйнай структуры, асаблівасцей ідэалогіі і тактыкі ліберальнай апазіцыі ў Беларусі быў пакладзены ў артыкуле А. Бонч-Асмалоўскага, уключанага ў зборнік «Беларусь», які быў выдадзены ў 1924 г. у сувязі з пяцігоддзем абвяшчэння БССР [10]. Аўтар закрануў палітычны аспект у дзейнасці такіх арганізацый, як Таварыства аматараў выяўленчага

мастацтва, Пушкінскай бібліятэкі, Таварыства аховы жанчын і іншых. Аднак пісаў ён, галоўным чынам, пра апазіцыю царызму ў Мінскай губерні.

На пачатку XX ст. ліберальнай ідэалогіі, асабліва пры вырашэнні нацыянальнага і аграрнага пытанняў, прытрымліваліся некаторыя яўрэйскія і польскія палітычныя партыі, якія распаўсюджвалі сваю дзейнасць на тэрыторыі Беларусі.

Пытанні яўрэйскага ліберальнага руху на беларускіх землях закранаюцца ў працах Ю. І. Гесена і С. М. Дубнова, прысвечаных гісторыі яўрэяў у Расійскай імперыі [11; 12]. Дзейнасць Саюза дасягнення раўнапраўя яўрэяў у Расіі, а таксама іншых яўрэйскіх грамадскіх арганізацый часткова асвятлялася ў зборніках “Расія і яўрэі”, якія выдаваліся за мяжой [13].

Польскі нацыянальны рух на беларускіх землях у айчыннай гістарыяграфіі доўгі час не з’яўляўся аб’ектам спецыяльнага даследавання. Хаця існуюць працы, прысвечаныя асобным аспектам гэтага руху. Так, шмат справядлівых заўваг наконт дзейнасці на тэрыторыі Беларусі польскіх землеўладальнікаў і гарадской інтэлігенцыі можна знайсці у кнізе А. Цвікевіча [14]. Палітычную дзейнасць польскіх землеўласнікаў і прадстаўнікоў каталіцкага духавенства ў сваёй манаграфіі разгледзеў К. Шабуня [15]. Ён засноўваўся, галоўным чынам, на аналізе думскіх выступленняў польскіх дэпутатаў і разглядаў толькі той аспект іх палітычнай дзейнасці, які быў звязаны з аграрным пытаннем. Пры гэтым аўтар грунтаваўся на пазіцыі, што адзіным абаронцам сялянства былі бальшавікі і толькі іх праграма цалкам адпавядала гэтым інтарэсам. Адным з першых польскіх даследчыкаў, хто прадпрыняў спробу аналізу польскага нацыянальнага руху на тэрыторыі Беларусі, быў публіцыст, навуковец і палітык Л. Васілеўскі [16]. Ён ахарактарызаваў першыя польскія палітычныя партыі краю, прычым асноўную ўвагу ўдзяліў Канстытуцыйна-каталіцкай партыі і Польскай дэмакратычна-нацыянальнай партыі на Літве, якія па многіх пытаннях займалі ліберальныя пазіцыі.

У канцы 1950-х – 1970-я гг. крытыка культу асобы Сталіна, спробы пераасэнсавання асобных гістарычных фактаў узмацнілі цікавасць да вывучэння непралетарскіх партый. Аднаўлялася ленінская канцэпцыя трох палітычных лагераў у Першай расійскай рэвалюцыі, што павысіла цікавасць і да гісторыі лібералізму ў Расійскай імперыі. Аднак да канца 1960-х гг. у савецкай гістарыяграфічнай навуцы не існавала даследаванняў з комплексным аналізам усіх бакоў праблематыкі ліберальных партый. Вывучаліся толькі яе асобныя аспекты, найбольшая ўвага надавалася аграрнаму, нацыянальнаму пытанням, праблеме ўвядзення земстваў у заходніх губернях. Найперш, гэта працы У. В. Коміна і Л. М. Спірына [17; 18].

У 1970–1980-я гг. выходзяць працы па гісторыі асобных партый ліберальнага кірунку. Ліберальным рухам пачатку XX ст. займаліся К. Ф. Шаціла, Н. А. Балашова і іншыя даследчыкі [19–20]. Упершыню лібералізм стаў разглядацца як цэласная з’ява, якая бярэ пачатак у земскім лібералізме, такім чынам, была пастаўлена праблема ўзаемасувязі “старога” паслярэформеннага земскага лібералізму з “палітычным кірункам расійскай буржуазіі” напярэдадні і ў перыяд Першай расійскай рэвалюцыі. Была таксама ўдакладнена перыядызацыя працэсу станаўлення лібералізму ў Расіі як комплекснай з’явы ідэалогіі, палітыкі і арганізацыі.

Аб розных аспектах гісторыі Канстытуцыйна-дэмакратычнай партыі пісалі В. В. Шалахаеў, Н. Г. Думава і іншыя гісторыкі [21–23]. В. В. Шалахаеў даследаваў асноўныя этапы стварэння партый кадэтаў і акцябрыстаў, іх арганізацыйную структуру і колькасць, сацыяльны склад, праграмныя палажэнні і тактыку. Праўда, аб дзейнасці канстытуцыйных дэмакратаў і “Саюза 17 кастрычніка” ў беларускіх губернях у яго працах згадваецца толькі эпізадычна [21–22]. У манаграфіі Н. Г. Думавай былі разгледжаны асобныя аспекты дзейнасці фракцыі кадэтаў у IV Дзяржаўнай думе, зроблена спроба вывучэння лібералаў у комплексе з іншымі расійскімі партыямі ў кантэксце вырашэння імі тых ці іншых праблем (аграрнай, нацыянальнай і інш.) [23]. Я. Д. Чэрменскі прааналізаваў пазіцыі расійскай буржуазіі і дзеянні царскага ўрада ў ходзе Першай расійскай рэвалюцыі. У яго манаграфіі ёсць сведчанні і пра дзейнасць ліберальнай апазіцыі на тэрыторыі Беларусі [24]. У цэлым, аўтарамі была зроблена спроба выявіць узровень апазіцыйнасці ліберальных партый, у прыватнасці кадэтаў, напярэдадні і ў ходзе Першай расійскай рэвалюцыі, была пастаўлена праблема характару перапляцення апазіцыйных і згодніцкіх тэндэнцый у пра-

грамных устаноўках і тактычнай дзейнасці лібералаў, хоць аб’ектыўна ў тых умовах яна не магла быць вырашана.

Як ужо адзначалася, аб’ектам вывучэння навукоўцаў з’яўлялася думская, а таксама выдавецкая дзейнасць палітычных партый на тэрыторыі Беларусі. Саперніцтва паміж рознымі палітычнымі партыямі і арганізацыямі беларускіх губерняў у перыяд выбарчых кампаній у Дзяржаўную думу часткова разглядалася С. М. Сідзельнікавым, А. А. Васілеўскім і іншымі даследчыкамі [25–26]. Палітычную барацьбу ў Беларусі і дзейнасць дэпутатаў ад беларускіх губерняў у Дзяржаўнай думе даследаваў Я. Запруднік [27]. У манаграфіі М. А. Марцюховай раскрываецца ўдзел палітычных партый і арганізацый, у тым ліку кадэтаў і акцябрыстаў, у грамадска-палітычным жыцці Беларусі ў перыяд афармлення, выбараў і дзейнасці І Дзяржаўнай думы Расійскай імперыі ў жніўні 1905 – ліпені 1906 г. [28].

Грамадска-палітычныя погляды ліберальнай апазіцыі ў Беларусі пачатку ХХ ст. аналізаваліся М. В. Рожыным на прыкладзе вывучэння мінскай газеты “Северо-Западный край” [29]. У. М. Конан даследаваў палітычны радыкалізм і кансерватызм на прыкладзе газет “Белорусский вестник”, “Северо-Западный край”, “Голос провинции”, “Окраина”, “Минская речь”, “Минское слово” і іншых [30].

Такім чынам, да канца 1980-х гг. намаганнямі даследчыкаў, нягледзячы на захаванне пэўных стэрэатыпаў савецкай гістарыяграфіі, былі дэталёва прааналізаваны структура, эвалюцыя, праграмы і тактыка палітычных партый ліберальнага кірунку ў пачатку ХХ ст. Была зроблена выснова аб тым, што перыяд паміж 1895 і 1905 гг. быў часам завяршэння арганізацыйнага афармлення лібералізму, які прайшоў шлях ад земстваў да палітычных партый; звернута ўвага на тое, што ва ўмовах нарастаючай рэвалюцыйнай хвалі, імклівага фарміравання правага і левага крыла ліберальнага руху лібералы спрабавалі дамагчыся палітычнага і ідэалагічнага ўплыву на масы, стаць самастойнай сілай у палітычнай барацьбе і рэфармаваць краіну, надаўшы ёй аблічча буржуазна-канстытуцыйнай дзяржавы.

Разам з гэтым варта мець на ўвазе, што ўся літаратура аб ліберальных партыях Расіі пачатку ХХ ст. з’явілася не ў выніку прызнання самакаштоўнасці лібералізму, а толькі ў сувязі з вывучэннем іх як палітычных праціўнікаў бальшавікоў. Гэта вызначыла і ідэалагізаваны падыход да спосабу падачы матэрыялу і адбору фактаў, што прыводзіла да суб’ектыўных высноў (паранейшаму нават кадэты называліся “антыдэмакратычнай” і “ліберальна-манархічнай” партыяй). Не праводзілася таксама сістэмнага аналізу рэфармісцкай ідэалогіі, захоўваўся тэзіс аб яе недасканаласці ў параўнанні з рэвалюцыйнай.

Наступны перыяд развіцця гістарыяграфіі праблемы пачаўся на мяжы 1980–1990-х гг. Менавіта у гэты час узмацніўся працэс назапашвання новых якасных параметраў, у значнай ступені абумоўленых зменамі палітычнага становішча ў краіне, што дазволіла шэрагу даследчыкаў у пачатку 1990-х гг. паставіць пытанне аб адналінейнасці традыцыйнага падыходу да разгляду гісторыі ліберальных партый.

Вялікая роля ў вывучэнні лібералізму ў постсавецкі перыяд належыць В. В. Шалахаеву і А. М. Медушэўскаму, якія вывелі даследаванне дадзенай праблематыкі на якасна новы ўзровень. В. В. Шалахаеў у сваіх працах раскрыў змястоўны бок уяўленняў лібералаў аб пераўтварэнні тагачаснай расійскай рэчаіснасці. Ён прыйшоў да высновы, што сістэмаўтваральнай у лібералізме з’яўляецца ідэя індывідуальнай свабоды, а ўсе астатнія структурныя элементы, якія складаюць сістэму ліберальных каштоўнасцей, выконваюць функцыі перадумоў і ўмоў для найбольш адэкватнай самарэалізацыі чалавека. Прычым сістэму ідэй аўтар увязаў з праграмамі канкрэтных палітычных партый. Ён прааналізаваў стаўленне канстытуцыяналістаў да праблем вайны і рэвалюцыі, перспектыў мадэрнізацыі краіны, фарміравання грамадзянскай супольнасці і прававой дзяржавы, а таксама ліберальную пастаноўку і варыянты вырашэння нацыянальнага, сацыяльнага і іншых надзённых пытанняў таго часу [31]. А. М. Медушэўскі даследаваў расійскі канстытуцыйны працэс у параўнальнай перспектыве. Ён меркаваў, што пасля 1905 г. у краіне ўсталяваўся рэжым уяўнага канстытуцыяналізму, гістарычна супрацьлеглага сапраўднаму (заходнееўрапейскаму) варыянту канстытуцыяналізму [32]. Аб’ектам даследавання дадзенага аўтара з’яўляюцца таксама стратэгія лібералаў, іх рэфарматарскія праекты і тэарэтычныя пабудовы. Так, напрыклад, лічачы сістэмаўтваральным для лібералізму паняцце правоў асобы, ён адзна-

чае, што канкрэтная праграма лібералізму змяняецца ў адпаведнасці з тым, дэфіцыт якіх правоў (эканамічных, сацыяльных, палітычных, нацыянальных, рэлігійных) асабліва адчувальны для дадзенага грамадства. Адсюль, на думку даследчыка, вынікае даволі распаўсюджаная супярэчнасць: «Постоянное изменение форм либеральной идеологии и даже некоторых ее содержательных параметров» [33, с. 43].

У пачатку 1990-х гг. з'яўляюцца айчынныя даследаванні, у якіх адным з кампанентаў выступае вывучэнне ліберальнай тэматыкі. Гэта працы па гісторыі беларускай дзяржаўнасці, аграрнага пытання, расійскіх рэвалюцый і палітычных партый [34–36]. Пэўную ролю адыгрываюць даследаванні па гісторыі сумежных праблем – земскага самакіравання, Дзяржаўнай думы, Часовага ўрада, расійскага палітычнага масонства [37–39]. Разам з тым неабходна адзначыць, што большасць даследаванняў праводзілася ў агульнарасійскім кантэксце. Спецыфіка, умовы дзейнасці ліберальных партый і іх адгалінаваннняў на беларускіх землях вывучаліся не дастаткова.

У апошнія гады беларускія гісторыкі працягваюць вывучаць праблемы гісторыі ліберальных партый. Гэтай тэматыцы прысвечана даследаванне Д. С. Лаўрыновіча [40]. Асноўная ўвага ў працы нададзена аналізу дзейнасці вядучых палітычных партый ліберальнага кірунку – канстытуцыйных дэмакратаў і акцябрыстаў, а таксама арганізацый, якія падзялялі іх ідэалогію. Раскрыты ўмовы іх фарміравання на тэрыторыі Беларусі: наяўнасць пэўных сацыяльных слаёў грамадства – чыноўнікаў, інтэлігенцыі, памешчыкаў рымска-каталіцкага веравызнання; грамадскіх арганізацый і органаў самакіравання (гарадскіх і земскіх), якія атрымалі ва ўмовах Першай расійскай рэвалюцыі магчымасць рэалізаваць свае палітычныя мэты. Важным у даследаванні з'яўляецца аналіз тэрытарыяльнага размяшчэння, арганізацыйнай структуры, колькасці, канфесійнага, нацыянальнага і сацыяльнага складу ліберальных арганізацый і іх саюзнікаў у заходніх губернях, дзе ў параўнанні з іншымі рэгіёнамі Расійскай імперыі вялікім было прадстаўніцтва католікаў і іўдзеяў. Разам з тым аўтар фактычна не закранае пытання аб магчымасці кансалідацыі розных аб'яднанняў у адзіную партыю беларускага лібералізму. Раскрываючы дзейнасць ліберальных арганізацый, аўтар не надае належнай увагі аналізу польскіх палітычных партый ліберальнага кірунку, якія распаўсюджвалі сваю дзейнасць на тэрыторыю Беларусі. У той жа час у даследаванні абгрунтавана сцвярджаецца, што спецыфіка нацыянальнага складу КДП у Паўночна-Заходнім краі з'явілася прычынай таго, што ў параўнанні з кадэтамі цэнтра Расіі беларускія кадэты займалі больш радыкальныя пазіцыі, выказваліся за роўнасць нацый, свабоду нацыянальнага жыцця, увядзенне мясцовага самакіравання, адукацыі на роднай мове, прадастаўленне раўнапраўя яўрэйскаму насельніцтву.

У 2018 г. выйшла з друку калектыўная манаграфія "Грамадска-палітычнае жыццё ў Беларусі, 1772–1917 гг.". Розныя аспекты афармлення і дзейнасці ліберальных партый (агульнарасійскіх і нацыянальных) у канцы XIX – пачатку XX ст. асвятляюць М. М. Забаўскі, М. А. Сакалова і А. У. Унучак. Адзначаецца, што грамадскія арганізацыі і групы, якія ўзнікалі ў канцы XIX ст. на беларускіх землях, будучы па сутнасці сваёй ліберальнымі, займаліся вырашэннем сваіх надзённых праблем, якія ўрэшце зводзіліся да ўсталявання грамадзянскіх правоў і свабод. Лідары ліберальнай апазіцыі гэтых зямель – І. Віткевіч, І. Мятлін, А. Аляксандраў і інш. – пазней увайшлі ў склад КДП. Ліберальныя праграмы мелі і дзеючыя на тэрыторыі беларуска-літоўскіх губерняў Саюз для дасягнення паўнапраўя яўрэйскага народа ў Расіі і Польская нацыянальна-дэмакратычная партыя. Аднак слабая дыферэнцыраванасць групавых інтарэсаў перашкаджала эфектыўнай кансалідацыі ліберальнага руху: паколькі фундаментальным прынцыпам лібералізму з'яўляецца жыццёва неабходны мінімум правоў асобы, у розных палітычных плынях, якія выказвалі інтарэсы пэўных груп насельніцтва, фармуляваліся розныя праграмы з патрабаваннем эканамічных, сацыяльных, рэлігійных, палітычных і іншых правоў. Разам з тым, на думку аўтараў, ліберальны рух стаў стымулам фарміравання і адным з першых рэальных элементаў грамадзянскай супольнасці на беларускіх землях у пачатку XX ст. Гэты аспект грамадскага жыцця ўстойліва развіваўся ў беларуска-літоўскіх губернях да 1917 г. [41, с. 445].

У цэлым, сучасная гістарыяграфія зыходзіць з наступных палажэнняў: праграмы ліберальных партый былі накіраваны на фарміраванне грамадзянскай супольнасці, прававой дзяржавы, рацыянальнай і эфектыўнай рынкавай эканомікі, цывілізаванае рашэнне нацыянальных і канфесійных праблем. Канчатковай мэтай было забеспячэнне ўсебаковага развіцця асобы.

**Высновы.** Такім чынам, расійская і айчынная гістарыяграфія грунтоўна, з розных канцэптуальных і метадалагічных пазіцый вывучыла ліберальны рух пачатку ХХ ст., адзначыўшы практычна ўсе магчымыя пункты гледжання на яго ролю і месца ў грамадска-палітычным жыцці краіны. Далейшыя перспектывы навуковага пошуку па дадзенай праблематыцы знаходзяцца ў розных плоскасцях: выяўленне і вывучэнне тых фактараў грамадска-палітычнага развіцця Беларусі, якія абумовілі немагчымасць гістарычнага кампрамісу паміж уладай і лібераламі; больш дэталёвае вывучэнне палітычных біяграфій і сістэм поглядаў прадстаўнікоў ліберальнага руху, прычым не толькі лідараў, што збольшага ўжо зроблена, але і „простых“ удзельнікаў, а таксама фактараў, якія ўплывалі на іх светапогляд; дэталёвае вывучэнне сацыякультурнага асяроддзя на беларускіх землях, у якім фарміраваліся ліберальныя каштоўнасці, і многае іншае. Патрабуе абнаўлення метадалагічны апарат гістарычных даследаванняў: выкарыстанне макра- і мікрападыходаў новай сацыяльнай гісторыі, псіхагісторыі, семіётыкі; вырашаць даследчыя праблемы неабходна сродкамі, запазычанымі з розных сфер ведаў. Відавочна, што гісторыя лібералізму на беларускіх землях працягвае заставацца важнай састаўной часткай гістарычнай навукі.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Винавер, М. М. Недавнее: Воспоминания и характеристики / М. М. Винавер. – 2-е изд., доп. – Париж : [б. и.], 1926. – XI, [3], 320 с.

2. Гредескул, Н. Проект закона о равноправии / Н. Гредескул // Первая Государственная дума. – СПб., 1907. – Вып. 2 : Законодательная работа : сб. ст. / Н. А. Гредескул [и др.]. – С. 111–141.

3. Милюков, П. Н. Воспоминания / П. Н. Милюков. – М. : Политиздат, 1991. – 527 с.

4. Струве, П. Б. На разные темы (1893–1901) : сб. ст. / П. Б. Струве. – СПб. : Тип. А. Е. Колпинского, 1902. – 555 с.

5. Общественное движение в России в начале ХХ века / под ред. Л. Мартова, П. Маслова, А. Потресова. – СПб. : Тип. т-ва «Общественная польза», 1909–1914. – Т. 3, кн. 5 : Партии – их состав, развитие и проявление в массовом движении, на выборах и в Думе. – 1914. – 643 с.

6. Луначарский, А. В. Воспоминания: из революционного прошлого / А. В. Луначарский. – Харьков : Пролетарий, 1925. – 79 с.

7. Ленин, В. И. Объявление об издании «Рабочей газеты» / В. И. Ленин // Полн. собр. соч. – Изд. 5-е. – М., 1960–1981. – Т. 19. – 1968. – С. 409–415.

8. Формы национального движения в современных государствах: Австро-Венгрия. Россия. Германия : [сборник] / под ред. А. И. Кастелянского. – СПб. : Тип. т-ва «Общественная Польза», 1910. – 824 с.

9. Луцкевіч, А. Да гісторыі беларускага руху : выбр. тв. / А. Луцкевіч. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 2003. – 287 с.

10. Бонч-Асмалоўскі, А. Лібэральна-опозыцыйны рух на Беларусі / А. Бонч-Асмалоўскі // Беларусь: нарысы гісторыі, эканомікі, культурнага і рэвалюцыйнага руху / пад агул. рэд. А. Сташэўскага, З. Жылуновіча, У. Ігнатоўскага. – Менск, 1924. – С. 169–176.

11. Гессен, Ю. И. История еврейского народа в России / Ю. И. Гессен ; с предисл. и библиогр., сост. В. Ю. Гессеном при участии В. Е. Кельнера. – Изд. испр. – М. : Евр. ун-т ; Иерусалим : Gesharim, 1993. – 241, 236, [12] с. – (Памятники еврейской исторической мысли).

12. Дубнов, С. М. Евреи в России и Западной Европе в эпоху антисемитской реакции / С. М. Дубнов. – М. ; Петроград : Л. Д. Френкель, 1923. – Кн. 2 : Евреи в России в царствование Николая II (1894–1914). – 102 с.

13. Россия и евреи : сборник 1-й / Отечеств. об-ние рус. евреев за границей. – Репринт, воспроизведение изд. 1924 г. (Берлин). – Paris : YMCA-press, 1978. – 232 с.

14. Цвікевіч, А. «Западно-руссизм»: нарысы з гісторыі грамадзкай мыслі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в. / А. Цвікевіч. – 2-е выд. (воспроизведение изд.: Менск, 1929). – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 350 с.

15. Шабуня, К. И. Аграрный вопрос и крестьянское движение в Белоруссии в революции 1905–1907 гг. / К. И. Шабуня. – Минск : Изд-во М-ва высш., сред. спец. и проф. образования БССР, 1962. – 435 с.

16. Wasilewski, L. Litwa i jej ludy / L. Wasilewski. – Warszawa : Księg. Nauk., 1907. – 77 s. – (Bibljoteka spółczesna).

17. Комин, В. В. История помещичьих, буржуазных и мелкобуржуазных политических партий в России : факультатив. курс лекций / В. В. Комин. – Калинин : [б. и.], 1970. – Ч. 1 : 1900 – июнь 1917 г. – 277 с.

18. Спирин, Л. М. Крушение помещичьих и буржуазных партий в России (начало ХХ в. – 1920 г.) / Л. М. Спирин. – М. : Мысль, 1977. – 366 с.

19. Шацилло, К. Ф. Русский либерализм накануне революции 1905–1907 гг. Организация. Программы. Тактика / К. Ф. Шацилло ; отв. ред. В. И. Бовыкин. – М. : Наука, 1985. – 347 с.

20. Балашова, Н. А. Российский либерализм начала ХХ века: (банкротство идей Московского еженедельника) / Н. А. Балашова. – М. : Изд-во Моск. ун-та, 1981. – 186 с.

21. Шелохаев, В. В. Кадеты – главная партия либеральной буржуазии в борьбе с революцией 1905–1907 гг. / В. В. Шелохаев. – М. : Наука, 1983. – 327 с.

22. Шелохаев, В. В. Партия октябристов в период первой российской революции / В. В. Шелохаев ; отв. ред. С. В. Тютюкин. – М. : Наука, 1987. – 157 с.

23. Думова, Н. Г. Кадетская партия в период Первой мировой войны и Февральской революции / Н. Г. Думова ; отв. ред. В. Я. Лаверычев. – М. : Наука, 1988. – 244 с.

24. Черменский, Е. Д. Буржуазия и царизм в первой русской революции / Е. Д. Черменский. – 2-е изд., перераб. и доп. – М. : Мысль, 1970. – 448 с.

25. Сидельников, С. М. Образование и деятельность Первой Государственной думы / С. М. Сидельников. – М. : Изд-во Моск. ун-та, 1962. – 382 с.

26. Василевский, А. А. Выборы в IV Государственную Думу в Белоруссии / А. А. Василевский // Проблемы социально-экономического развития БССР : сб. науч. тр. / Мин. гос. пед. ин-т. – Минск, 1976. – С. 68–74.

27. Запруднік, Я. Палітычнае змаганне за Беларусь у царскіх Дзяржаўных думах (1906–1917 гг.) / Я. Запруднік // ARCHE. – 2009. – № 1–2 (76–77). – С. 43–217.

28. Мартюхова, М. А. На переломе революции: общественно-политическое движение в Белоруссии в связи с учреждением Государственной думы в России (август 1905 – июль 1906 г.) / М. А. Мартюхова. – Минск : Наука и техника, 1986. – 141 с.

29. Рожин, Н. В. Газета «Северо-Западный край»: очерк общественно-политической, философской и эстетической позиций, 1902–1905 гг. / Н. В. Рожин. – Минск : Изд-во Белорус. гос. ун-та, 1970. – 167 с.

30. Конон, В. М. Проблемы искусства и эстетики в общественной мысли Белоруссии начала XX в. / В. М. Конон ; под ред. С. Х. Александровича. – Минск : Наука и техника, 1985. – 200 с.

31. Шелохаев, В. В. Либеральная модель переустройства России / В. В. Шелохаев. – М. : РОССПЭН, 1996. – 277 с.

32. Медушевский, А. Н. Демократия и авторитаризм: российский конституционализм в сравнительной перспективе / А. Н. Медушевский. – М. : РОССПЭН, 1997. – 650 с.

33. Модели общественного переустройства России. XX век / В. В. Зверев [и др.] ; отв. ред. В. В. Шелохаев. – М. : РОССПЭН, 2004. – 607 с.

34. На шляху станаўлення беларускай нацыі: гістарыяграфічныя здабыткі і праблемы / В. В. Яноўская [і інш.] ; навук. рэд. В. В. Яноўская. – Мінск : Беларус. навука, 2011. – 311 с.

35. Соколова, М. А. Общественные объединения и движения как факторы формирования гражданского общества в Беларуси (конец XVIII – начало XX в.) : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / М. А. Соколова ; Ин-т истории НАН Беларуси. – Минск, 2000. – 20 с.

36. Сташкевич, Н. С. Помещичье-монархические партии и организации в Беларуси / Н. С. Сташкевич, И. Ф. Романовский // Палітычныя партыі Беларусі : дапам. для вывучаючых гісторыю Беларусі. – Мінск, 1994. – С. 217–261. – (Серыя «Гістарычныя сшыткі ; 2).

37. Слобожанин, В. П. Земское самоуправление в Белоруссии (1905–1917 гг.) / В. П. Слобожанин. – Минск : Гавриленко В. Г., 1994. – 85 с.

38. Забаўскі, М. М. Расійская Дзяржаўная дума ў лёсах Беларусі (1906 – 1917 гг.) / М. М. Забаўскі – Мінск : БДПУ, 2008. – 267 с.

39. Томашевич, В. М. Зарождение и развитие сионизма в северо-западных губерниях Российской империи (начало 80-х гг. XIX в. – 1907 г.) : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.03 / В. М. Томашевич ; Белорус. гос. ун-т. – Минск, 2003. – 20 с.

40. Лавринович, Д. С. Общероссийские либеральные партии и организации в общественно-политической жизни Беларуси (1905 – 1918 гг.) : автореф. дис. … д-ра ист. наук : 07.00.02 / Д. С. Лавринович ; Белорус. гос. ун-т. – Минск, 2013. – 48 с.

41. Грамадска-палітычнае жыццё ў Беларусі, 1772–1917 гг. / А. У. Унучак [і інш.] ; рэдкал.: В. В. Даніловіч (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2018. – 573 с.

## References

1. Vinaver M. M. *Recent: Memories and characteristics*. 2nd ed. Paris, 1926. XI, [3], 320 p. (in Russian).

2. Gredeskul N. Draft law on equality. *First State Duma. Issue 2. Legislative work*. St. Petersburg, 1907, pp. 111–141 (in Russian).

3. Milyukov P. N. *Memoirs*. Moscow, Politizdat Publ., 1991. 527 p. (in Russian).

4. Struve P. B. *On various topics (1893–1901): digest of articles*. St. Petersburg, Printing House A. E. Kolpinsky, 1902. 555 p. (in Russian).

5. Martov L., Maslov P., Potresov A. (eds.). *The social movement in Russia at the beginning of the twentieth century. Vol. 3, book 5. Parties their composition, development and manifestation in the mass movement, in elections and in the Duma*. St. Petersburg, Printing House of the Partnership “Public Benefit, 1914. 643 p. (in Russian).

6. Lunacharskii A. V. *Memoirs: from the revolutionary past*. Kharkov, Proletarii Publ., 1925. 79 p. (in Russian).

7. Lenin V. I. Announcement on the publication of the “Working Newspaper”. *Complete works. 5nd ed.* Moscow, 1968, vol. 19, pp. 409–415 (in Russian).

8. Kastelyanskii A. I. (ed.). *Forms of the national movement in modern states. Austria-Hungary. Russia. Germany*. St. Petersburg, Printing House of the Partnership “Public Benefit”, 1910. 824 p. (in Russian).

9. Lutskevich A. *On the history of the Belarusian movement: selected works*. Minsk, Belaruski knigazbor Publ., 2003. 287 p. (in Belarusian).

10. Bonch-Asmalouski A. Liberalna-opozytsyyny movement in Belarus. *Belarus’: narysy gistoryi, ekanomiki, kul’turnaga i revalyutsyinaga rukhu* [Belarus: essays on the history, economy, culture and the revolutionary movement]. Minsk, 1924, pp. 169–176 (in Belarusian).

11. Hesse Yu. I. *History of the Jewish people in Russia*. Moscow, Jewish University, Jerusalem, Gesharim Publ., 1993. 241, 236, [12] p. (in Russian).

12. Dubnov S. M. *Jews in Russia and Western Europe during the era of antisemitic reaction. Book 2. Jews in Russia during the reign of Nicholas II (1894–1914)*. Moscow, Petrograd, L. D. Frenkel' Publ., 1923. 102 p. (in Russian).

13. *Russia and the Jews: collection 1*. Paris, YMCA-Press, 1978. 232 p. (in Russian).

14. Tsvikevich A. *"West russizm": Sketches from the history of social thought in Belarus, in the nineteenth and early twentieth century*. 2nd ed. Minsk, Navuka i tekhnika Publ., 1993. 350 p. (in Belarusian).

15. Shabunya K. I. *The agrarian question and the peasant movement in Belarus in the revolution of 1905–1907*. Minsk, Publishing House of the Ministry of Higher, Secondary Special and Professional Education of the BSSR, 1962. 435 p. (in Russian).

16. Wasilewski L. *Litwa i jej ludy* [Lithuania and its people]. Warsaw, Księgarnia Naukowa, 1907. 77 p. (in Polish).

17. Komin V. V. *History of landlord, bourgeois and petty-bourgeois political parties in Russia*. *Part 1. 1900–June 1917*. Kalinin, 1970. 277 p. (in Russian).

18. Spirin L. M. *The collapse of the landlord and bourgeois parties in Russia (beginning of the twentieth century – 1920)*. Moscow, Mysl` Publ., 1977. 366 p. (in Russian).

19. Shatsillo K. F. *Russian liberalism on the eve of the revolution of 1905–1907. Organization. Programs. Tactics*. Moscow, Nauka Publ., 1985. 347 p. (in Russian).

20. Balashova N. A. *Russian liberalism of the early twentieth century*. Moscow, Publishing house of Moscow University, 1981. 186 p. (in Russian).

21. Shelokhaev V. V. *Cadets – the main party of the liberal bourgeoisie in the fight against the revolution of 1905–1907*. Moscow, Nauka Publ., 1983. 327 p. (in Russian).

22. Shelokhaev V. V. *Octobrist party during the First Russian Revolution*. Moscow, Nauka Publ., 1987. 157 p. (in Russian).

23. Dumova N. G. *Cadet party during the First World War and the February Revolution*. Moscow, Nauka Publ., 1988. 244 p. (in Russian).

24. Chermenskii E. D. *Bourgeoisie and tsarism in the First Russian Revolution*. 2nd ed. Moscow, Mysl` Publ., 1970. 448 p. (in Russian).

25. Sidel'nikov S. M. *Education and activities of the First State Duma*. Moscow, Publishing House of Moscow University, 1962. 382 p. (in Russian).

26. Vasilevskii A. A. Elections to the IV State Duma in Belarus. *Problemy sotsial'no-ekonomicheskogo razvitiya BSSR: sbornik nauchnykh trudov* [Problems of social and economic development of the BSSR: collection of scientific papers]. Minsk, 1976, pp. 68–74 (in Russian).

27. Zaprudnik J. Political struggle for Byelorussia in the Tsarist State Dumas, 1906–1917. *ARCHE*, 2009, no. 1–2 (76–77), pp. 43–217 (in Belarusian).

28. Martyukhova M. A. *At the turn of the revolution: The socio-political movement in Belarus in connection with the establishment of the State Duma in Russia (August 1905 – July 1906)*. Minsk, Nauka i tekhnika Publ., 1986. 141 p. (in Russian).

29. Rozhin N. V. *Newspaper "Northwest Territory": essay on socio-political, philosophical and aesthetic positions, 1902–1905*. Minsk, Publishing House of the Belarusian State University, 1970. 167 p. (in Russian).

30. Konon V. M. *The problems of art and aesthetics in the social thought of Belarus at the beginning of the 20th century*. Minsk, Nauka i tekhnika Publ., 1985. 200 p. (in Russian).

31. Shelokhaev V. V. *Liberal model of the reorganization of Russia*. Moscow, ROSSPEN Publ., 1996. 277 p. (in Russian).

32. Medushevskii A. N. *Democracy and authoritarianism: Russian constitutionalism in a comparative perspective*. Moscow, ROSSPEN Publ., 1997. 650 p. (in Russian).

33. Zverev V. V., Kanishcheva N. I., Medushevskii A. N., Repnikov A. V., Starostin E. V., Tyutyukin S. V., Shelokhaev V. V. *Models of the social reorganization of Russia. XX century*. Moscow, ROSSPEN Publ., 2004. 607 p. (in Russian).

34. Yanouskaya V. V., Anofranka N. V., Sakalova M. A., Unuchak A. U., Filatava A. M. *In the establishment of the Belarusian nation: historiographical achievements and challenges*. Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2011. 311 p. (in Belarusian).

35. Sokolova M. A. *Public associations and movements as factors in the formation of civil society in Belarus (late XVIII – early XX centuries)*. Abstract of Ph.D. diss. Minsk, 2000. 20 p. (in Russian).

36. Stashkevich N. S. Landowner-monarchist parties and organizations in Belarus. *Palitychnyya partyi Belarusi* [Political parties in Belarus]. Minsk, 1994, pp. 217–261 (in Russian).

37. Slobozhanin V. P. *Zemsky self-government in Belarus (1905–1917)*. Minsk, Gavrilenko V. G. Publ., 1994. 85 p. (in Russian).

38. Zabauski M. M. *Russian State Duma in fate Belarus (1906–1917)*. Minsk, Belarusian State Pedagogical University, 2008. 267 p. (in Belarusian).

39. Tomashevich V. M. *The origin and development of Zionism in the northwestern provinces of the Russian Empire (beginning of the 80s of the XIX century – 1907)*. Abstract of Ph.D. diss. Minsk, 2003. 20 p. (in Russian).

40. Lavrinovich D. S. *All-Russian liberal parties and organizations in the social and political life of Belarus (1905–1918)*. Abstract of Ph.D. diss. Minsk, 2013. 48 p. (in Russian).

41. Unuchak A. U., Anofranka N. V., Gancharenka K. D., Gryshkevich T. V., Gushchynski I. G., Dzmitryeva V. P., Zhytko A. P., Zabauski M. M., Padarozhnyaya A. A. *Social and political life in Belarus, the 1772–1917 biennium*. Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2018. 573 p. (in Belarusian).

## Информация об авторе

**Трубчик Павел Анатольевич** – кандидат исторических наук, доцент. Белорусский государственный педагогический университет имени Максима Танка (ул. Советская, 18, 220030, Минск, Республика Беларусь). E-mail: trubchik.p@mail.ru

## Information about the author

**Pavel A. Trubchyk** – Ph. D., Associate Professor. Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank (18 Sovetskaya Str., 220030 Minsk, Belarus). E-mail: trubchik.p@mail.ru